**Аляксандр Дзмітрыевіч Трашчыла (1960, Пінскі раён), спартсмен (лёгкая атлетыка), трэнер, заслужаны майстр спорту СССР (1988), чемпіён свету (1983)**



Нарадзіўся ў в.Аснежыцы Пінскага раёна. Актыўна займаўся лёгкай атлетыкай. У 1989 г. скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут фізічнай культуры.

З 1988 па 1991 гг. працаваў трэнерам-выкладчыкам у спартыўным клубе Арміі Беларускай ваеннай акругі, а ў 1991 - 1993 гг. - дырэктарам спартыўнага клуба "Няміга". З 1993 г. стаў старшым трэнерам нацыянальнай маладзёжнай каманды Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы, працаваў дзяржтрэнерам. У канцы мая 2012 года пасля арышту галоўнага трэнера зборнай Беларусі Анатоля Бадуева Аляксандр Трашчыла быў назначаны выконваючым абавязкі рулявога нацыянальнай каманды. 25 кастрычніка 2012 г. прыказам Міністэрства спорту і турызму стаў галоўным трэнерам зборнай Беларусі па легкай атлетыцы і кіраваў сборнай на Гульнях-2012 у Лондане, дзе беларускія спартсмены ўпершыню ў суверэннай гісторыі засталіся без медалёў (Надзея Астапчук, якая заваявала золата з-за станоўчай допінг-пробы была пазбаўлена ўзнагароды). Са студзеня 2014 г. – старшы трэнер нацыянальнай каманды па Мінскай вобласці.

Чэмпіён СССР сярод юніёраў (1980) у бегу на 300 м у закрытых памяшканнях. Чэмпіён Спартакіяды народаў СССР. Двухкратны прызёр СССР, пераможца спаборніцтваў на прызы братоў Знаменскіх.

На чэмпіянаце Еўропы 1982 года сборная СССР у складзе Аляксандра Трашчыла, Паўла Рошчына, Паўла Канавалава і Віктара Маркіна заняла 3-е месца, уступіўшы камандам ФРГ і Велікабрытаніі. Бронзавы прызёр чэмпіянату Еўропы (1982) у эстафеце 4х400 м у складзе сборнай каманды СССР.

На чэмпіянаце свету 1983 года Аляксандр разам з Сяргеем Лавачовым, Мікалаем Чарнецкім і Віктарам Маркіным заваяваў залаты медаль у эстафеце 4х400 метраў. Двухкратны рэкардсмен СССР у эстафеце 4х400 м, пераможца Кубка васьмі нацый (1983). У 1983 годзе ў Хельсінкі ў складзе сборнай каманды СССР становіцца чэмпіёнам свету ў эстафеце 4х400 м.

Сярэбраны прызёр спаборніцтваў “Дружба-84” у бегу на 400 м (1983). Вынік, паказаны Аляксандрам на дыстанцыі 400 метраў на спаборніцтвах “Дружба-84”, з’яўляецца нацыянальным рэкордам Беларусі. Рэкардсмен Беларусі (1984) у бегу на 400 м (трэнеры Г.П.Бухарына, Г.І.Чэвычалаў, Б.А.Міхальчук, А.І.Юлін).

Аляксандр Трашчыла з’яўляецца заслужаным майстарам спорту СССР, членам прэзідыума БФЛА.

Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалём "За працоўную доблесць".

1. **Трощило** Александр Дмитриевич // Регионы Беларуси: энциклопедия: в 7 т. Минск, 2009. Т.1. Кн.2. Брестская область. С.413
2. **Трощило** Александр Дмитриевич // Республика Беларусь: энциклопедия. Минск, 2008. Т.7. С.270
3. **Трощило** Александр Дмитриевич / А.М.Петриков // Спортивная энциклопедия Беларуси. Минск, 2005. С.441
4. **Трощило** Александр Дмитриевич // Спортсмены Пинщины / авт.-сост. И.А.Кибак. Минск, 2004. С.101
5. **Легкая** атлетика / М.Е.Кобринский [и др.]; под общ. ред. М.Е.Кобринского, Т.П.Юшкевича, А.Н.Конникова. 2-е изд. Минск: Тесей, 2012. Из содерж.: А.Трощило в главах 7, 8. С.92, 106.
6. **Шахнович, Т.** Главный тренер сборной Беларуси по легкой атлетике Александр Трощило: “Для спортсменов должны быть другие зарплаты”: [интервью] / Татьяна Шахнович // Комсомольская правда. 2013. 29 августа (№163). С.31
7. **Тасман, Б.** Королеве – лидера!: [упоминается А.Трощило] / Борис Тасман // Прессбол. 2013. 23 августа (№124). С.11
8. **Тасман, Б.** Системный приговор: [вопросы к А.Трощило] / Борис Тасман // Прессбол. 2013. 22 августа (№123). С.1;4
9. **Дубицкий, М.** Александр Трощило: одна за всех, или кто во что горазд / Михаил Дубицкий // Спортивная панорама. 2013. 20 августа (№121). С.4
10. **Тасман, Б.** Перед штурмом: [беседа с гл. тренером нац. команды А.Трощило] / Борис Тасман // Прессбол. 2013. 1 марта (№32). С.16
11. **Дубицкий, М.** Александр Трощило: о клановости и пересудах / Михаил Дубицкий // Спортивная панорама. 2013. 1 февраля (№17). С.2
12. **Сивый, А.** Александр Трощило: “Радости пока мало…” / Алесь Сивый // Народная Воля. 2012. 21 лістапада
13. **Тасман, Б.** Между прошлым и будущим: [беседа с главным тренером А.Трощило] / Борис Тасман // Прессбол. 2012. 14 ноября (№169). С.1;7
14. **Александр** Трощило — мастер спорта международного класса // Легкая атлетика. 1984. №7
15. **Александр** Трощило. – Режим доступа: // http: // sportpanorama. by/ themes / 4860/
16. **Очень** тяжелая легкая атлетика: [интервью с А.Трощило]. – Режим доступа: // http: // respublika.sb.by / kompetentnyy-sobesedhik-128 / articleloochen-tyazhelaya-legkaya-atletika-.html
17. **Петриков, А.М.** Трощило Александр Дмитриевич / А.М.Петриков // Спортивная энциклопедия Беларуси. - Минск: БелЭн, 2005. — С. 441